Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# БЯЗМЕЖНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## ВОПЫТ РАБОТЫ ГАРАДСКІХ БІБЛІЯТЭК З ЛЮДЗЬМІ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Гродна, 2020

Бязмежныя магчымасці: вопыт работы гарадскіх бібліятэк з людзьмі з інваліднасцю / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. С. Рубель ; рэд. Н. Ю. Наземцава. — Гродна, 2020. — 28 с.

Выданне змяшчае інфармацыю пра вопыт работы па абслугоўванні дарослых і дзяцей з рознымі абмежаваннямі здароўя ў ДУК «ЦБС г. Гродна».

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

# БЯЗМЕЖНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## ВОПЫТ РАБОТЫ ГАРАДСКІХ БІБЛІЯТЭК З ЛЮДЗЬМІ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

Інваліднасць – гэта значнае абмежаванне жыццядзейнасці, якое прыводзіць да сацыяльнай непрыстасаванасці з прычыны парушэння здольнасцяў чалавека да самаабслугоўвання, перамяшчэння, навучання, працы. У гэтую катэгорыю могуць трапіць усе: дзеці, падлеткі, моладзь, людзі сярэдняга ўзросту, пажылыя. Пры гэтым большасць з іх маюць такія ж інтарэсы і патрэбы, як і людзі без сэнсарных ці іншых фізічных абмежаванняў. Пэўная частка інвалідаў вядзе даволі актыўны лад жыцця: яны вучацца, працуюць, займаюцца творчасцю. Але ёсць і такія, якія часткова або цалкам пазбаўленыя магчымасці рухацца, а значыць, абмежаваныя ў доступе да аб’ектаў інфраструктуры – ізаляваныя ад грамадства. Любая ізаляцыя сведчыць не толькі пра дэфіцыт зносін, але і пра дэфіцыт інфармацыі, якую звычайны чалавек атрымлівае з усіх даступных крыніц: тэлебачанне, радыё, інтэрнэт, рэсурсы бібліятэк і інш.

Абслугоўванне людзей з абмежаваннямі здароўя – адзін з прыярытэтных накірункаў дзейнасці дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна».

З мэтай стварэння даступнай інфармацыйнай прасторы для дадзенай катэгорыі карыстальнікаў калектыў ЦБС г. Гродна ажыццяўляе разнастайныя сацыяльныя праекты, арганізуе інфармацыйна-масавыя мерапрыемствы, якія спрыяюць уключэнню людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя ў грамадскае жыццё.

Штогод гарадскія бібліятэкі наведваюць больш за **800** чытачоў з абмежаванямі здароўя, з іх **100** – дзеці і падлеткі. Яны атрымліваюць у карыстанне каля **30** тыс. экзэмпляраў кніг, перыядычных выданняў і іншых дакументаў.

Далучэнне да кнігі і бібліятэкі з’яўляецца абавязковай умовай паўнавартаснай сацыяльнай рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя. Дзейнасць гродзенскіх бібліятэк у дапамогу сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў заключаецца, перш за ўсё, у

аператыўным прадастаўленні ім грамадска значнай інфармацыі, у падборы, рэкамендацыі і дастаўцы неабходнай літаратуры, арганізацыі карыснага вольнага часу.

Абслугоўванне людзей з абмежаваннямі здароўя, заснаванае на **канцэпцыі даступнага бібліятэчнага асяроддзя** для гэтай катэгорыі насельніцтва, уключае ў сябе:

- арганізацыю камфортнай унутранай прасторы бібліятэк, прадастаўленне спецыяльных бібліятэчных тэхнічных сродкаў;
- фарміраванне фондаў на розных носьбітах для карыстальнікаў з аўдыяльным, візуальным, тактыльным успрыманнем інфармацыі;
- стварэнне і рэалізацыю сацыяльных праектаў у галіне абслугоўвання людзей з абмежаваннямі здароўя праз інавацыйныя бібліятэчныя тэхналогіі;
- прадастаўленне спецыяльных бібліятэчных паслуг (заказ літаратуры па тэлефоне, абслугоўванне на даму).

**Асноўныя задачы** работы бібліятэк па абслугоўванні людзей з інваліднасцю:

- далучэнне да чытання, развіццё творчых здольнасцяў, духоўнае ўзбагачэнне людзей з абмежаваннямі здароўя;
- дапамога адукацыйнаму працэсу, задавальненне інтарэсаў чытачоў па ўсіх галінах ведаў;
- інфармацыйная падтрымка і асвета бацькоў дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя;
- інфармацыйнае забеспячэнне спецыялістаў, якія працуюць з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва.

Сваю дзейнасць гарадскія бібліятэкі **каардынуюць з грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі**:

- Аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна»;

- Аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна»;
- Дзённым цэнтрам Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа;
- Гродзенскім абласным адзяленнем грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку»;
- Прыватным унітарным прадпрыемствам «Фільтр» грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку»;
- Дзяржаўнай установай адукацыі «Гродзенская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку»;
- Дзяржаўнай установай адукацыі «Гродзенская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху»;
- Дзяржаўнай установай адукацыі «Дапаможная школа № 1 г. Гродна» (для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця);
- Дзяржаўнай установай адукацыі «Спецыяльны яслі-сад № 5 г. Гродна» (для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця);
- Дзяржаўнай установай адукацыі «Спецыяльны яслі-сад № 81 г. Гродна для дзяцей з парушэннямі зроку».

Штогод для асаблівых карыстальнікаў у межах цыклаў **«БУДЗЕМ РАЗАМ»** (па рабоце з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва) і **«МЫ І АСАБЛІВЫЯ ДЗЕЦІ»** (па рабоце з дзецьмі-інвалідамі) у бібліятэках праходзіць каля **100** мерапрыемстваў рознай накіраванасці.

Бібліятэчныя формы масавай работы з інвалідамі арыентаваны на арганізацыю карыснага вольнага часу, яны дапамагаюць наведвальнікам пераадолець або прадухіліць пачуццё асабістай непаўнавартаснасці, садзейнічаюць міжасобасным зносінам і ўзаемападтрымцы.

Наведванне мерапрыемстваў, чытанне кніг і перыядычных выданняў упрыгожваюць жыццё людзей з абмежаваннямі здароўя, робяць яго годным і насычаным падзеямі.

Для невідушчых карыстальнікаў і людзей з аслабленым зрокам у структуры ЦБС г. Гродна з 2010 года працуе **СПЕЦЫЯЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ ІНВАЛІДАЎ ПА ЗРОКУ** (СБІЗ).

Штогод установу наведваюць больш за **600** чытачоў, амаль палова з іх – людзі з парушэннем зроку.

**Да паслуг карыстальнікаў** у бібліятэцы прадстаўлены:



- 2 аўтаматызаваныя рабочыя месцы;
- электронная лупа Eclipse (павялічвае шрыфт у 32 разы);
- Daisyplaer для агучвання тэкстаў;
- праграма экраннага доступу JAWS і сінтэзатар маўлення;
- анлайн-бібліятэка «Логас»;
- публічны цэнтр прававой інфармацыі.

Дадзенае абсталяванне забяспечвае магчымасць маўленчага доступу да самага разнастайнага кантэнту, дазваляе працаваць у інтэрнэце, праслухоўваць матэрыялы з фонду бібліятэкі. Падключэнне да першай інтэрнацыянальнай анлайн-бібліятэкі для інвалідаў па зроку «Логас» пашырыла магчымасці па прадастаўленні агучаных кніг. Кожны карыстальнік можа бясплатна спампаваць на свой носьбіт аўдыякнігу.

Дзякуючы нераўнадушным бібліятэкарам у 2015–2020 гадах у ЦБС г. Гродна паспяхова рэалізавалі **6** сацыяльных праектаў, прызначаных, у першую чаргу, для невідушчых і людзей са слабым зрокам:

- «Гродна: пачуць нябачнае»: краязнаўчы тыфлапраект;
- «Гродна: гісторыя ў гуку»: па агучванні і выданні аўдыякніг гродзенскіх гісторыкаў і краязнаўцаў;
- «Гісторыя на кончыках пальцаў»: пераклад кніг па гісторыі Гродна ў шрыфт Брайля;
- «Цёплыя кнігі»: па стварэнні тактыльных кніг для невідушчых дзяцей;

- «Чытаем са смакам»: аўдыязапіс урыўкаў з мастацкіх твораў з апісаннем момантаў, звязаных з ежай;
- Стварэнне аўдыядэскрыпцыі да мастацкіх фільмаў.

У 2015 годзе дзякуючы спонсарскай падтрымцы з’явіліся першыя аўдыякнігі пра Гродна, створаныя ў межах рэалізацыі праекта **«Гродна: пачуць нябачнае»**. Раней у фондзе СБІЗ краязнаўчая літаратура існавала толькі ў друкаваным выглядзе, што рабіла яе недаступнай для невідушчых карыстальнікаў. Чатыры кнігі па гісторыі Гродна: «Горадна, Горадзен, Гродна» А. Марціновіча, «О парке Жилибера и зоопарке Кохановского» В. Саяпіна, «Гродно: театр, кино, цирк» В. Саяпіна і Т. Касатай, «Sursum Corda: Красная книга Гродно» Андрэя Павача «загучалі» з аднаго дыска. Аўдыякніу атрымалі ўсе гродзенскія бібліятэкі, спецыяльныя бібліятэкі для інвалідаў па зроку ў Рэспубліцы Беларусь і абласныя грамадскія арганізацыі «БелТІЗ». Інтарэс да гэтага выдання быў вялікі. Так нарадзілася ідэя праекта **«Гродна: гісторыя ў гуку»**, які быў завершаны ў 2018 годзе. Кіраўнік і душа праекта – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ГЦБ імя А. Макаёнка Н.Ю. Наземцава. Невялікая сума была сабрана на краўдфандынгавай платформе Social Weekend – праект стаў паўфіналістам IX рэспубліканскага конкурсу сацыяльных праектаў. Астатнія сродкі бібліятэкары зарабілі дзякуючы выязным мерапрыемствам з цыкла «Гісторыя, якую трэба захоўваць» на прадпрыемствы горада (адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гроднахлебпрам», «Гродзенскі мясакамбінат», «Беларусбанк», «Гродзенская тытунёвая фабрыка “Нёман”», «Радыёхваля»), якія прайшлі з удзелам гісторыкаў А. Вашкевіча, А. Чарнякевіча, галоўнага рэдактара выдавецтва «ЮрСаПрынт» А. Рыжага.






Акцёрам драматычнага тэатра беларускай арміі, рэжысёрам, драматургам У. Лісоўскім і выкладчыкам «Школы радыёвядучых» У. Шубко былі агучаны 8 кніг В. Саяпіна, у тым ліку напісаных ім у суаўтарстве з А. Вашкевічам і А. Яршовым. Выданне Андрэя Павача «Пад крылом Каложы» атрымала самастойную аўдыяверсію дзякуючы ўдзелу ў праекце каманды «Радыё Гродна 101,2».




У 2017 годзе бібліятэкар СБІЗ Р.У. Ланеўская пачала працу над праектам **«Гісторыя на кончыках пальцаў»** па пераводзе кніг краязнаўчай тэматыкі ў шрыфт Брайля. Дапамогу ў падрыхтоўцы выданняў аказалі супрацоўнікі інфармацыйнага цэнтра ГА «БелТІЗ» – яны выдалі кнігі «Маленькие мостики в Гродно» В. Саяпіна, «История гродненских площадей» В. Саяпіна, «Хранитель Жилибертии» Н. Канюк, «Гродненские мосты» А. Пышынскай, І. Трусава, «На гродзенскім бруку» В. Саяпіна і А. Вашкевіча на прынтары Брайля.




У 2016 годзе ў выніку рэалізацыі праекта **«Цёплыя кнігі»** было зроблена 5 рукадзельных тактыльных кніг пазнавальнай і рэабілітацыйнай накіраванасці: «Шчанюк» С. Міхалкова, вершы А. Барто, зборнік дзіцячай паэзіі, казкі «Калабок» і «Каласок».

У 2017 годзе ідэю бібліятэкараў падтрымалі педагогі школ агульнай сярэдняй адукацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна. Для іх бібліятэкары правялі майстар-клас па вырабе тактыльных кніг. У выніку ў фонд спецыяльнай бібліятэкі былі перададзены 23 «цёплыя кнігі», створаныя настаўнікамі і вучнямі гродзенскіх школ.

За праект па стварэнні тактыльных кніг для дзяцей з парушэннем зроку «Цёплыя кнігі» СБІЗ была ўзнагароджана спецыяльным дыпломам Рэспубліканскага конкурсу «Лепшая бібліятэка 2016 года» грамадскага аб’яднання «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя».

Бібліятэкар СБІЗ брала ўдзел у праекце сацыяльна-культурнай установы «МоцАрт» (г. Мінск), якая спецыялізуецца на інклюзіўных праектах у галіне нацыянальнай культуры. Яна вучылася мастацтву апісання жывапісу, фільмаў і скульптур у польскіх тыфлакаментатараў. У 2016 годзе ў рамках праекта «Бязмежнае кіно» адбыўся **паказ кінафільма «Белыя росы» з аўдыядэскрыпцыяй**, якую падрыхтавала Р.У. Ланеўская.



У 2018 годзе для навучэнцаў УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі каледж», якія займаюцца па спецыяльнасці «Лячэбны масаж» – гэта маладыя людзі са слабым зрокам, быў арганізаваны паказ фільма «Дзікае паляванне караля Стаха» з тыфлакаментарыямі, напісанымі СКУ «МоцАрт».




Многія падзеі ў жыцці чалавека суправаджаюцца застоллямі. Ежа надае жыццю смак, робіць яго ярчэй. Гастранамічная тэма натхняла многіх пісьменнікаў, якія напаўнялі свае творы смакам і водарам кулінарных шэдэўраў. У 2020 годзе спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку прапанавала сваім чытачам незвычайны аўдыяпраект **«Чытаем са смакам»**. Вядомая радыёвядучая Зінаіда Крылова чытала невялікія ўрыўкі з мастацкіх твораў з апісаннем момантаў, звязаных з ежай (гукавыя файлы). Тут жа – рэцэпты прыгатавання страў і напояў, якія згадваюцца ў творы. А ўжо слухачы вырашалі самі, што рабіць: устаць каля пліты або ўзяць у бібліятэцы кнігу.

У межах праекта было падрыхтавана **20** аўдыязапісаў. Прагучалі ўрыўкі з: апавядання «Выкраданне каралеўскага рубіну» А. Крысці (бібліятэкар прапанавала прыгатаваць англійскі калядны кекс), навэлы «Баляванне Бабеты» К. Бліксэн (рэцэпт чарапахавага супу), аповесці «Сабачае сэрца» М. Булгакава (гарачая закуска ад прафесара

Праабражэнскага «Маленькі цёмны хлебік»), паэмы «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча (рэцэпт бігаса па-польску), апавядання «Сірэна» А. Чэхава (рэцэпт кулябякі з мясам), рамана «Легенда аб Соннай Лагчыне» В. Ірвінга (рэцэпт гарбузовага пірага), кнігі «Гродзенскія гісторыі» Андрэя Павача (рэцэпт пячыста з арэхам і курыцай, запечанай у цесце), аповесці «Барбара Радзівіл» Ю. Татарынава (рэцэпт пірага з рыбай), аповесці «Манюня» Н. Абгаран» (рэцэпт стравы «Усходняя талерка»), зборніка «Адэскія апавяданні» І. Бабеля (рэцэпт стравы «Рыба ў моры»), «Мёртвыя душы» М. Гогаля (рэцэпт курніка) і інш.



Бібліятэкар спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку брала ўдзел у абласным праекце **#ГОДНАЕРОДНАЕ** па папулярызацыі беларускай нацыянальнай культуры. Яна стварыла **3** відэаролікі з запісам вершаў пра Беларусь, баек пра народныя лекі і сілу народных прыкмет у выкананні чытачоў бібліятэкі.

Штогод у СБІЗ для людзей з абмежаваннямі здароўя праходзіць каля **30** інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў. Сярод іх: удзел ў міжнароднай акцыі «Чытаем дзецям пра вайну», конкурс брайлістаў «Словы пад пальцамі ляцелі...» на лепшага чытача выданняў рэльефна-кропкавым шрыфтам, фальклорныя вячоркі «У Спаса ўсяго ў запасе», гадзіны рэабілітацыі «Знаёмцеся: архітэктура», «Маленькія сакрэты вялікай шафы», тактыльная экскурсія «Made in Hrodna» з удзелам гісторыка А. Вашкевіча і інш.



У 2019 годзе чытачы СБІЗ упершыню бралі ўдзел у Тыдні літаратуры краін Паўночнай Еўропы. Для дарослых арганізатары прапанавалі прачытаць главу з кнігі нарвежскага аўтара Карэн Бліксэн «Баляванне Бабеты». Спачатку ўдзельнікі гучных чытанняў пазнаёміліся з гісторыяй і сімволікай праекта: па крузе перадавалі сцяжкі з фігуркамі аленяў, падсвечнікі з незапаленымі свечкамі, каб невідушчыя маглі ўявіць, як выглядаюць гэтыя прадметы.

Тры главы з кнігі, прачытаныя ў межах праекта, пагрузілі слухачоў у жыццё нарвежскай вёскі канца XIX стагоддзя і дапамаглі пабываць на раскошным абедзе часоў Парыжскай камуны. За кубачкам гарбаты вырашылі даведацца канец гісторыі Бабетты і дачыталі кнігу да канца.



Запамінальнай была святочная праграма «Студзеньскае асарці», якая адбылася у пачатку 2020 года. З гарачай гарбатай і прысмакамі госці ўспаміналі традыцыі калядавання і варажбы са свайго дзяцінства, удзельнічалі ў віктарынах, розыгрышах, паслухалі легенду пра ўзнікненне ўсходняга гараскопа. Напрыканцы сустрэчы пад акампанемент баяна разам праспявалі любімыя зімовыя песні.



Чытачы спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку разам з бібліятэкарам, які іх суправаджаў, пабывалі на экскурсіі-анімацыі па Новым Свеце ў кампаніі журналістаў і жыхароў горада. Журналісты, змяняючы адзін аднаго, распавядалі гісторыі амаль пра кожны дом на шляху. Прапанаваны інтэрактыў стварыў для ўдзельнікаў «дапоўненую рэальнасць» і даў магчымасць праз уласныя адчуванні пазнаёміцца з гродзенскімі вуліцамі.

У рамках месячніка «Чалавек з белым кіем» на ўроку розначытання ў бібліятэцы пабывалі наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна». Гісторыя жыцця стваральніка пісьменства для сляпых Луі Брайля, пісьмо і чытанне па Брайлю, прылада для пісьма, электронная лупа, тактыльныя кнігі, праца на камп’ютары – усё выклікала жывую цікавасць у гасцей бібліятэкі.

У спецыяльнай бібліятэцы для інвалідаў па зроку для навучэнцаў агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку

праходзяць гадзіны рэабілітацыі «Цёплыя казкі» з выкарыстаннем тактыльных кніг.



Выхаванцы старэйшых груп дзяржаўнай установы адукацыі «Спецыяльны яслі-сад № 81 г. Гродна для дзяцей з парушэннямі зроку» разам з бібліятэкарам СБІЗ разглядалі і чыталі маляўнічыя кніжкі з аб'ёмнымі малюнкамі «Крэсіва» і «Спадарыня Мяцеліца», падораныя дабрачынным фондам «Ілюстраваныя кніжкі для маленькіх сляпых дзяцей» (РФ).

У бібліятэцы з мэтай арганізацыі вольнага часу невідушчых і людзей са слабым зрокам дзейнічае інтэлектуальны клуб «Эрудыт», які налічвае 11 удзельнікаў. Членамі яго з'яўляюцца інваліды па зроку І і ІІ груп. Сярод іх настаўнікі, музычныя работнікі, рабочыя УП «Фільтр». Наведванне аб'яднання садзейнічае задавальненню чытацкіх інтарэсаў, сацыяльнай рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадстве, пашырэнню камунікатыўных сувязяў інвалідаў па зроку.

Штогод члены клуба ў складзе каманды «Разумнікі» ўдзельнічаюць у турнірах «Сінхронны кубак Беларусі», «Моцная сям'я – моцная дзяржава» (г. Ваўкавыск), фестывалі «Кубак Валока і Вісека» (г. Ваўкавыск), адкрытым абласным інтэграваным інтэлектуальным турніры «Белы кій» (г. Гродна).



VIII абласны адкрыты інтэграваны інтэлектуальны турнір «Белы кій–2019» адбыўся 30 лістапада ў ДУ «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры». У ім удзельнічалі каманды з Гродна, Ваўкавыска, Шчучына, Ліды. З 20 каманд-удзельніц тры – дзіцячыя, і тры каманды складаліся з невідушчых і людзей са слабым зрокам. Арганізатары турніру – ЦБС г. Гродна і народны клуб «Высокі Волак». Праграма турніру была традыцыйная – конкурсы «6x6», «Медыя-азбука», «Што? Дзе? Калі?» і аўдыягульня «Тыфлакіно».



У трох з чатырох этапаў першае месца заняла каманда «Разумнікі». Уладальнікам кубка 2019 года стала ваўкавыская каманда «Крэмень». Удзельнікаў турніру віталі супрацоўнікі гарадскіх бібліятэк, якія прадставілі дэфіле «Архітэктурныя помнікі Гродна» і вакалісты ГА «БелТІЗ».

У 2020 годзе каманда «Разумнікі» брала ўдзел у міжнародным сінхронным турніры «Кубак малых гарадоў», які штогод праводзіцца ў межах фестывалю «Кубак Валока і Вісека» ў г. Ваўкавыску. Сёлета турнір праходзіў з 10 па 17 кастрычніка ў 7-мі краінах, 17-ці гарадах на 17-ці пляцоўках. Па выніках турніру сярод 49 каманд «Разумнікі» занялі 21 месца, у заліку сярод 20 каманд Рэспублікі Беларусь – 8 месца.

Для наведвальнікаў у СБІЗ дзейнічаюць выставы літаратуры: «Да кніжных скарбаў дакраніся» (літаратура, выкананая рэльефна-кропкавым шрыфтам), «Новыя магчымасці чытання» (тактыльныя кнігі), «Беларуская электроннная кніга», «Творчасць невідушчых».

У 2018 годзе ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку была ўзнагароджана дыпломам І ступені XXVI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».



**БІБЛІЯТЭКА № 3** супрацоўнічае з аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна». Установу наведваюць каля 60 карыстальнікаў з рознымі захворваннямі. У рабоце з інвалідамі бібліятэкары прымяняюць элементы арт-тэрапіі – адзін з псіхалагічных метадаў, у якім выкарыстоўваюцца магчымасці мастацтва для дасягнення станоўчых змен у інтэлектуальным, эмацыйным і асобасным развіцці чалавека.



Такім чынам, у бібліятэцы адбыліся экскурсіі ў музейны пакой «Лялечны дом», гучныя тэатралізаваныя чытанні ўрыўкаў з казкі Льюіса Кэрала «Аліса ў Краіне цудаў» і інсцэніроўкі мастацкіх твораў.



Святочнымі былі майстар-класы «Цуд навагодняй цацкі», «Майстэрня Дзеда Мароза» – бібліятэкары ладзілі заняткі па вырабе цацак з паперы і ваты, паштовак і інш. Творчыя заняткі дапаўнялі бібліяграфічныя агляды літаратуры.



Экспазіцыя музейнага пакоя «Лялечны дом» разам з гаспадынямі пабывала ў дзённым цэнтры Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа. Асаблівым гледачам былі прадстаўлены лялькі – казачныя персанажы, аповед пра кожную з іх суправаджаўся пытаннямі да аўдыторыі. Пасля віктарыны бібліятэкары прапанавалі інсцэніроўку ўрыўка «Вар’яцкае чаяванне» па казцы «Аліса ў Краіне цудаў».



*«Арт-тэрапія як спосаб сацыяльнай адаптацыі вельмі важная для людзей з рознымі захворваннямі, якія ў сілу сваіх фізічных або псіхалагічных асаблівасцей абмежаваныя ў сацыяльных кантактах. Творчы вопыт, развіццё новых навыкаў і ўменняў дазваляюць гэтым людзям удзельнічаць у жыцці грамадства, пашыраць кругагляд»*, – лічаць бібліятэкары.

**БІБЛІЯТЭКА № 4** працуе з аддзяленнем дзённага знаходжання для інвалідаў дзяржаўнай установы «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Гродна». Бібліятэку штогод наведваюць больш за 100 чытачоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. У 2016 годзе адбылася першая сустрэча ў клубе «Калейдаскоп», арганізаваным бібліятэкарамі для наведвальнікаў Цэнтра. Аб’яднанне налічвае 30 удзельнікаў. Штогод у клубе праходзіць 12 разнастайных па тэматыцы мерапрыемстваў. Сярод іх: краязнаўчае падарожжа «Каляндар народнага жыцця», гадзіна інфармацыі да 530-годдзя Францыска Скарыны «Дарога да беларускага слова», фальклорнае свята «Ой, калядачкі, калядкі», слайд-падарожжа «Сем цудаў Беларусі», краязнаўчая гадзіна «Старажытная гісторыя Гродна», пазнавальная гадзіна «Наша планета – наша здароўе», гадзіны цікавых паведамленняў «З гісторыі вялікіх адкрыццяў», «З гісторыі грошай», «Незвычайныя гісторыі рэчаў», бібліяграфічны агляд «Прэса ад хваробы і стрэсу» і інш.



Найбольш падабаюцца членам клуба мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі. Падчас краязнаўчай гадзіны «Гродзенская вобласць: вехі гісторыі» гаворка ішла аб гісторыі ўтварэння нашай вобласці, аб ліквідацыі наступстваў фашысцкай акупацыі, адраджэнні разбуранай народнай гаспадаркі. Дакументальны фільм «Гродзеншчына: шлях даўжынёй у 75 год» распавёў аб развіцці прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, аб медыцыне, спорце, адукацыі і культурным жыцці вобласці.

Віртуальнае падарожжа «Гродна: скрозь гады і стагоддзі» пазнаёміла маладых людзей з гродзенскімі велічнымі замкамі, вытанчанымі касцёламі, уражлівымі цэрквамі. Прэзентацыя «Мой горад Гродна» дазволіла палюбавацца архітэктурнымі помнікамі, убачыць выявы горада на старых фотаздымках і гравюрах. Бібліятэкары-экскурсаводы распавялі гісторыю горада, а дакументальны фільм «Гарады Беларусі. Гродна» пазнаёміў з гарадскімі славутасцямі.

Падчас краязнаўчай гадзіны «Нашы знакамітыя землякі» даведаліся пра людзей, якія нарадзіліся або жылі ў Гродне, чый лёс звязаны з горадам. Бібліятэкары падрыхтавалі прэзентацыю пра ўраджэнцаў Гродна: тэатральнага мастака Л. Бакста, стваральніка мовы эсперанта Л. Заменгофа, музыканта В. Дзядзюлю, акцёра А. Філіпчыка, спартсменаў В. Корбут, А. Курловіча і інш.



Краязнаўчая гадзіна «У горадзе маім – мой лёс» была прысвечана Віктару Саяпіну, гісторыку, аўтару шматлікіх артыкулаў і кніг аб Гродне. Члены клуба пазнаёміліся з кнігамі В. Саяпіна, даведаліся, як збіраўся краязнаўчы матэрыял, паглядзелі дакументальны фільм «Адзін дзень з жыцця. Віктар Саяпін».

У бягучым годзе ўлетку сябры клуба «Калейдаскоп» ладзілі пасяджэнні на свежым паветры. На пляцоўцы каля бібліятэкі прайшлі:

- гадзіна беражлівасці «Прырода. Экалогія. Будучыня» – маладыя людзі ўспомнілі правілы эканомнага выкарыстання электраэнергіі, эфектыўнага зберажэння цяпла, беражлівага расходу вады, абмеркавалі, для чаго трэба берагчы прыродныя рэсурсы Зямлі;
- урок здаровага ладу жыцця «Стыль жыцця – здароўе» – з сябрамі клуба гаварылі пра правільнае харчаванне, заняткі фізічнай культурай, загартоўванне, абмеркавалі, як засцерагчы сябе ад хваробаў і ўмацаваць свой імунітэт;
- бібліяграфічны агляд «Па старонках газет і часопісаў» – наведвальнікі мелі магчымасць пагартаць часопісы і газеты, даведацца апошнія навіны, праслухаць вытрымкі з найбольш цікавых публікацый;



- інфармацыйная гадзіна да 480-годдзя герба нашага горада «Гартаючы старонкі гісторыі Гродна» – бібліятэкары распавялі

гісторыю ўзнікнення герба з аленем Святога Губерта, падараванага гораду Бонай Сфорца яшчэ ў XVI стагоддзі;

- гадзіна гісторыі «Імёны ў летапісе вайны», прысвечаная юбілеям удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны В. Соламавай, Д. Карбышава і А. Сухамбаева – маладыя людзі даведаліся пра подзвігі герояў на тэрыторыі Гродна;
- гадзіна гісторыі «Фестываль прызямліўся ў Гродне» – сябрам клуба распавялі пра традыцыі Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур і самыя яркія моманты гэтага свята.



Дзейнасць клуба па інтарэсах «Калейдаскоп» стварае аптымальныя ўмовы для правядзення вольнага часу, далучэння да сацыяльна-культурных каштоўнасцей, задавальнення духоўных патрэб карыстальнікаў бібліятэкі.

**БІБЛІЯТЭКІ № 3, № 4, № 5, № 8, № 10, АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ГЦБ ІМЯ А. МАКАЁНКА** працуюць з дзецьмі-інвалідамі ў межах плана мерапрыемстваў «Мы і асаблівыя дзеці».

**ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ № 5 і № 8** наведваюць каля 100 дзяцей з рознымі абмежаваннямі здароўя. Яны атрымліваюць у карыстанне больш за 2,5 тыс. экзэмпляраў дакументаў. Штогод для іх арганізуюць каля 60 інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў.

Формы і метады арганізацыі работы з асаблівымі дзецьмі вельмі розныя. Бібліятэкары імкнуцца спрыяць адукацыі, пашырэнню кругагляду, развіццю творчых здольнасцей дзяцей і падлеткаў. Да кожнага дзіцяці яны шукаюць індывідуальны падыход, а пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў улічваюць захворванні дзяцей і іх магчымасці. Але самым галоўным пры абслугоўванні дзяцей з абмежаваннямі здароўя бібліятэкары лічаць увагу, чуласць і дабразычлівасць.

Больш за 15 гадоў **БІБЛІЯТЭКА № 5** працуе з навучэнцамі дзяржаўнай установы адукацыі «Гродзенская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннямі зроку». У бібліятэцы ладзяць гучныя чытанні і разнастайныя пазнавальна-забаўляльныя мерапрыемствы. Сярод іх: літаратурная гадзіна «Фарбы жыцця праз кнігу», віктарына «Героі любімых кніг», гульнявая праграма «Мудрасць кніжнай краіны», пазнавальна-забаўляльны марафон «Каб заўсёды смяяліся дзеці», урок этыкету «Ветлівасць на кожны дзень», гадзіны экаведаў «Браты нашы меншыя» і «Экалагічнае асарці», краязнаўчая вандроўка «Не замярзае рэчка часу, плывуць стагоддзі па вадзе», святочная праграма «Новы год да нас імчыць у госці» і інш.



Цікавым для дзяцей было знаёмства з жыхарамі гродзенскага заалагічнага парка. Яны пачулі гісторыю стварэння заапарка, даведаліся пра правілы догляду за жывёламі, прынялі ўдзел у віктарыне пра жывёльны свет і пазнаёміліся з дэкаратыўным трусам Люсяй, пацуком Асяй і хамячком Тусяй.



Для хлопчыкаў і дзяўчынак правялі ўрок «У свеце музыкі і гукаў», на якім дзеці пазнаёміліся з музычнымі інструментамі: цымбаламі, дудой, флейтай, маракасамі, паўдзельнічалі ў гульні «Адгадай інструмент па гуку». Завяршылася мерапрыемства вясёлым ансамблем.

Падчас краязнаўчай гадзіны «Пісьменнікі любімага горада» бібліятэкары распавялі пра творчасць В. Кудлачова, І. Фамянковай, Т. Сучковай, Г. Скаржынскай-Савіцкай. Дзеці з задавальненнем пазнаёміліся з новымі выданнямі аўтараў, чыталі вясёлыя вершы, апавяданні і казкі, якія заахвоцілі рабіць добрыя ўчынкі, радасна ўспрымаць свет.



Шквал станоўчых эмоцый, пазітыву і добрага настрою падарыла дзецям сустрэча з пісьменніццай Т.А. Сучковай «Па старонках любімых кніг Таццяны Сучковай», якую бібліятэкары арганізавалі ў школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі зроку. Таццяна Аркадзьеўна прачытала вершы, падзялілася сваімі сакрэтамі складання казак. Асаблівую цікавасць выклікалі прыпеўкі на школьную тэму.





Для вучняў дзяржаўнай установай адукацыі «Дапаможная школа № 1 г. Гродна» бібліятэкары ладзяць цыкл заняткаў «Бібліятэрапія». Кожную пятніцу дзеці і падлеткі прыходзяць у бібліятэку дзеля таго, каб пазнаёміцца з лепшымі кнігамі і часопісамі, прыняць удзел у тэматычных мерапрыемствах. Сярод іх: гадзіна бяспекі «Я па вуліцы іду», інфармацыйна-пазнавальныя праграмы «Азбука здароўя», «Звычкі карысныя і шкодныя», урок міласэрнасці «Мы – разам!», майстар-клас «Усе фарбы восені», гадзіна духоўнасці «У чаканні калядных цудаў», мульфеерверк «Навагоднія прыгоды» і інш. Падчас мерапрыемстваў дзеці з задавальненнем разгадваюць загадкі, прымаюць удзел у віктарынах і конкурсах, гартаюць кнігі і часопісы.

Навучэнцы дзяржаўнай установай адукацыі «Гродзенская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху» з задавальненнем наведваюць **БІБЛІЯТЭКУ № 8**. У бібліятэкараў свая методыка абслугоўвання кнігай гэтай катэгорыі карыстальнікаў – яны імкнуцца да ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці, павышэння інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу, лічаць карыснымі мерапрыемствы пазнавальнай накіраванасці. Так для іх былі

праведзены: пазнавальная гадзіна «Таямнічы свет птушак», урок-прэзентацыя «Знаёмімся з гродзенскімі паэтамі», гульнявая праграма «Чытай, гуляй – спазнай свой край», краязнаўчая гадзіна «Гродна: горад, які хвалюе», гадзіна цікавостак «Сябры здароўя», забаўляльная праграма «Свет у чаканні цудаў» і інш. Падчас мерапрыемстваў хлопчыкам і дзяўчынкам прыйшліся даспадобы вершы, апавяданні і казкі ў выкананні бібліятэкараў. І, вядома, не абыходзіцца без пасядзелак з чаяваннем.

Пра гісторыю Гродна, пра паходжанне герба, пра помнікі архітэктуры і славутыя мясціны нашага горада хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся падчас краязнаўчай гадзіны «Гродна: горад, які хвалюе».



Цікавай была экагадзіна «Чароўны свет жывёл і птушак» – бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з разнастайнасцю жывёльнага свету, распавялі якую карысць жывёлы і птушкі прыносяць чалавеку.

**АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ГЦБ ІМЯ А. МАКАЁНКА** працуе з вучнямі дзяржаўнай установай адукацыі «Дапаможная школа № 1 г. Гродна». Чытачамі бібліятэкі з’яўляюцца15 школьнікаў. Звычайна па пятніцах бібліятэкары ладзяць для іх пазнавальныя мерапрыемствы. Гэта: гадзіны цікавостак «Дзівосныя бібліятэкі свету», «Якую музыку слухаюць дзеці», гістарычнае падарожжа «Вандроўка па зямлі Гродзенскай», гадзіна забаў «Казачная завіруха» і інш.



Падчас адной з сустрэч у бібліятэцы гаварылі аб танках. Танкавая тэматыка з’явілася дзякуючы вучню Матусевічу Арцемію, які захапляецца баявымі машынамі, іх гісторыяй і развіццём. Бібліятэкары распавялі пра першы танк і першы танкавы бой, пра тое, як дзеці ў СССР збіралі грошы на танк «Малютка».



Запомнілася хлопчыкам і дзяўчынкам праца ў творчай майстэрні «Пісьмо Дзеду Марозу». Яны даведаліся, як правільна напісаць пісьмо, каб споўніліся мары, напісалі яго, размалявалі навагоднія паштоўкі, якія потым падарылі сваім сябрам і родным. Яшчэ адзін з вечароў пятніцы бібліятэкары разам з дзецьмі прысвяцілі вырабу навагодніх падарункаў для бацькоў, дзядуляў і бабуль, каб кожны атрымаў радасць і ўвагу ад сваіх блізкіх.



У 2020 годзе бібліятэкары бралі ўдзел у акцыі, прымеркаванай да Міжнароднага дня абароны дзяцей «Калі ты нефармат». Акцыю праводзіў «Цэнтр дапамогі “Вера”» – дабрачынная некамерцыйная арганізацыя дапамогі дзецям-інвалідам, цяжкахворым дзецям, дзецям-сіротам, дзецям з малазабяспечаных сем’яў, а таксама дарослым, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. У падарунак дзецям-сіротам бібліятэкары перадалі кнігі і відэазапіс чытання твора А. Арловай «Гэта грузавік, а гэта прычэп».



Супрацоўнікі спецыяльнай бібліятэцы для інвалідаў па зроку і аддзела абслугоўвання дзяцей ГЦБ імя А. Макаёнка ў бягучым годзе ўдзелінічалі ў майстар-класе па вырабе тактыльнай паштоўкі па матывах верша Р. Мухі «Злы сабака», прызначанай для дзяцей з парушэннем зроку. Арганізатарам майстар-класа выступіў праект «ЗаЧытанне» (г. Мінск). У рэжыме Zoom-канферэнцыі ўдзельнікі ў розных гарадах малявалі, выразалі, клеілі. У выніку ў кожнага атрымалася паштоўка з малюнкам, тактыльнай ілюстрацыяй, плоскадрукаваным тэкстам і шрыфтам Брайля.





**БІБЛІЯТЭКА № 3** для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя (вучняў ДУА «Сярэдняя школа № 12 г. Гродна») арганізавала святочную пазнавальную праграму «Дзе жыве Дзед Мароз?». Хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся, як святкуюць Новы год у розных краінах і якія Дзяды Марозы там існуюць, пазнаёміліся з выставай кніг на навагоднюю тэму і зрабілі на памяць калектыўны фотаздымак.

Супрацоўнікі **БІБЛІЯТЭКі № 4** наведвалі дзённы цэнтр для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа. Бібліятэкары не толькі прыносілі новыя кнігі, але і чыталі дзецям цікавыя творы. Хлопчыкі і дзяўчынкі слухалі казкі «Калабок», «Зайчыкі», «Рукавічка», з задавальненнем удзельнічалі ў інсцэніроўках мастацкіх твораў пры дапамозе пальчыкавых лялек.



**БІБЛІЯТЭКА № 10** ладзіць разнастайныя мерапрыемствы для выхаванцаў дзяржаўнай установы адукацыі «Спецыяльны яслі-сад № 5 г. Гродна»

Штогод у першыя дні зімы бібліятэкары праводзяць дабрачынную акцыю «Падары дабрыню і радасць». У 2019 годзе для выхаванцаў старэйшых груп ясляў-сада яны падрыхтавалі забаўляльную праграму. Адкрыццё прайшло пад выступ дашкольнага калектыву «Светлячкі».



Маленькіх гасцей парадавалі сваім выкананнем песень вучаніцы гімназіі № 9. Добры настрой і станоўчыя эмоцыі падарыла дзецям клаўнэса Люся. У завяршэнні акцыі супрацоўнікі Рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці ўручылі кожнаму прыемны падарунак.

Кожны год бібліятэкары ладзяць мерапрыемствы да **Міжнароднага дня інвалідаў**. Сярод іх: гадзіны дабрыні «За роўныя магчымасці» (філіял № 1), «Падарожжа на востраў Дабрыні», «Кропелькай цяпла сагрэем душу» (бібліятэка № 2), «Пасялі дабро ў сваім сэрцы» (бібліятэка № 8), гадзіны духоўнасці «Міласэрнасць – водгук душы» (бібліятэка № 2), «Весялей жыць, калі дабро тварыць» (бібліятэка № 3), «Святло чалавечай дабрыні» (бібліятэка № 8), «Не з намі, але сярод нас» (ГЦБ імя А. Макаёнка), літаратурна-пазнавальная праграма «BOOK-PARTY», вечарыны «Ты ў гэтым свеце не адзін», «Ад сэрца да сэрца» (бібліятэка № 4) і інш.

У бібліятэцы № 2 правялі гадзіну дабрыні «Добра там, дзе жыве міласэрнасць». Бібліятэкары нагадалі дзецям пра такія чалавечыя якасці, як дабрыня і спачуванне, пра тое, што грамадства павінна клапаціцца аб слабых і хворых. Распавялі пра людзей з абмежаваннямі здароўя, як яны дасягаюць сваёй мэты, правялі віктарыну «Чароўныя словы», паказалі відэаролікі пра міласэрнасць.



Падчас вечара «Ты ў гэтым свеце не адзін» у бібліятэцы № 4 бібліятэкары распавялі пра знакамітых людзей, для якіх інваліднасць не стала жыццёвай перашкодай. Маладыя людзі, якія наведваюць клуб «Калейдаскоп», удзельнічалі ў конкурсах і гульнях, праявіўшы ўважлівасць і кемлівасць. Пачастункі і кінавіктарына падарылі ўсім зарад станоўчых эмоцый.



Двойчы ў Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка праходзілі **курсы бальнічных клоўнаў «Funny nose»**. Удзельнікі займаліся сцэнічнай мовай, вывучалі прынцыпы працы з лялькамі. Разгледзелі, як зрабіць тэатр ценяў і якія праблемы з яго дапамогай можна вырашыць.



Тэме абслугоўвання людзей з інваліднасцю прысвячаліся мерапрыемствы па павышэнні кваліфікацыі бібліятэкараў ЦБС г. Гродна. Так, у 2019 годзе ў ГЦБ імя А. Макаёнка адбыўся **круглы стол** **«Інклюзіўнае ўзаемадзеянне ў бібліятэчным абслугоўванні людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя»**. Пытанні, вынесеныя для абмеркавання, тычыліся не толькі бібліятэчных праектаў, але і пытанняў адукацыйнага асяроддзя як фактару адаптацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця, супрацоўніцтва бібліятэк з партнёрамі – установамі спецыяльнай адукацыі, дабрачыннымі арганізацыямі і інш. Супрацоўнікі ЦБС г. Гродна падзяліліся вопытам стварэння сацыяльных праектаў, арыентаваных на невідушчых і людзей са слабым зрокам, распавялі пра працу з дзецьмі з парушэннем слыху і з цяжкасцямі ў навучанні. Завуч ДУА «Сярэдняя школа № 16 г. Гродна» В.А. Саўчык раскрыла сутнасць інклюзіўнай адукацыі на прыкладзе сваёй установы. Як праходзіць інтэграцыя дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі ў паўсядзённае жыццё распавяла кіраўнік дзённага цэнтра для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа І.Г. Ларыёнава. Сумесная дабрачынная дзейнасць гарадскіх бібліятэк і СДУ «Цэнтр ПАРА» была раскрыта ў выступе намесніка дырэктара ўстановы А.М. Шыкуць. Пра тое, што смехам таксама можна лячыць распавялі трэнеры грамадскага аб’яднання «Бальнічныя клоўны Fanny nose» Святлана і Дзмітрый Венісяцкія. Вопытам па вырабе тактыльных кніг у праекце «Убачыць сэрцам» падзяліўся педагог дадатковай адукацыі ДУА «Сярэдняя школа № 35 г. Гродна імя М.А. Волкава» Д.А.Трафімаў. На працягу мерапрыемства дзейнічала кніжная выстава «Я – іншы: звычайныя кнігі пра незвычайных дзяцей».



15 лютага 2020 года, у Міжнародны дзень людзей з анкалагічнымі захворваннямі, супрацоўнікі Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна далучыліся да дабрачыннага кірмашу ў падтрымку праекта «Дом для жыцця» сацыяльна-дабрачыннай установы «Цэнтр ПАРА». **Кніжны фрымаркет «Дом без кнігі – дзень без сонца»** размясціўся на пляцоўцы каля фантана ў гандлёвым цэнтры Old Sity. Увазе наведвальнікаў прапаноўвалі кнігі для сямейнага чытання.



Удзельнікам фрымаркета раздавалі кніжныя закладкі ад выдавецтва «ЮрСаПрынт» з надпісам «Я дапамог». Дзяцей запрашалі на гучныя чытанні кніг пра ката Шмяка Р. Скотана, «Грубіянку ў крапінку» Э. Карла і майстар-клас па вырабе кніжнай закладкі. Настрой стваралі танцавальныя нумары ў выкананні ўдзельнікаў студыі «Бэбідэнс» і вакалістаў студыі «Мікс».



12 лістапада 2020 года ў дзіцячай бібліятэцы № 6 адбылася прэзентацыя **тактыльна-брайлеўскай кнігі і аўдыяверсіі казкі** знакамітай беларускай пісьменніцы **Алены Масла «Мяне завуць Лахнэска»**. На імпрэзу сабраліся прадстаўнікі Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна, Гродзенскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку, журналісты. Унікальнасць праекта СКУ «МоцАрт» у тым, што твор можна не толькі прачытаць, але і ўбачыць яго галоўнага героя, і пачуць, пра што ён гаворыць. Казка Алены Масла ў афармленні вядомай мастачкі Аксаны Аракчэевай надрукавана шрыфтам Брайля на беларускай мове. Малюнак у кнізе не толькі яркі, але і рэльефны, цёплы навобмацак. Стварылі яго

супрацоўнікі бібліятэкі № 3 г. Гродна, сябры клуба «Гродзенская лялька» І. Сотнікава і І. Вараб’ёва. Да кнігі прыкладаецца аўдыядыск з запісам казкі ў выкананні Народнага артыста Беларусі Віктара Сяргеевіча Манаева. Усяго выдадзена 7 такіх кніг. Іх атрымалі спецыяльныя школы-інтэрнаты для дзяцей з парушэннямі зроку абласных цэнтраў Беларусі і спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку горада Гродна. На прэзентацыі выдання госці мелі магчымасць не толькі ўбачыць незвычайную кнігу, але і пачуць відэазварот Алены Масла і Аксаны Аракчэевай да чытачоў, пагутарыць з гродзенскімі майстрыхамі. Юны чытач спецыяльнай бібліятэкі Данііл Грабавіцкі прадэманстраваў свае навыкі чытання па Брайлю на беларускай мове.



ЦБС г. Гродна брала ўдзел у 3 конкурсе праектных прапаноў Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь на 2014–2020 гады ў межах Еўрапейскага інструмента суседства (Праграма). Заяўка ENI-LLB-3-444 **«Трансгранічная бібліятэчная сетка для стварэння даступнага асяроддзя і ўмацавання сацыяльнага яднання ўразлівых груп»** была адобрана Сумесным маніторынгавым камітэтам Праграмы і Урадам Рэспублікі Беларусь. Мэта праекта – скарачэнне сацыяльнай ізаляцыі, павышэнне якасці жыцця сацыяльна неабароненых груп насельніцтва з дапамогай стварэння новых паслуг у бібліятэчнай прасторы для задавальнення культурных патрэб; абмен вопытам з трансгранічнымі партнёрамі і паляпшэнне якасці працы бібліятэчных спецыялістаў.

Бібліятэкары дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» імкнуцца, каб карыстальнікам з абмежаванымі магчымасцямі здароўя было ўтульна і камфортна ў гарадскіх бібліятэках, стараюцца акружыць іх увагай і душэўнай цеплынёй, падтрымаць пачуццё ўпэўненасці ў сабе і ва ўласнай значнасці.

# ЗМЕСТ

Бязмежныя магчымасці : вопыт работы
гарадскіх бібліятэк з людзьмі з інваліднасцю 3

# БЯЗМЕЖНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**ВОПЫТ РАБОТЫ ГАРАДСКІХ БІБЛІЯТЭК З ЛЮДЗЬМІ З ІНВАЛІДНАСЦЮ**

Складальнік А. С. Рубель

Рэдактар Н. Ю. Наземцава